зовательных технологий; прохождение практики за границей; помощь с трудоустройством и его высокий уровень.

Данные особенности рынка образования и специфические черты рекламы стоит учитывать, проводя рекламную кампанию. Наиболее эффективным будет охват всех направлений рекламной деятельности с использованием современных технологий информационного пространства.


1. *Кривцова, М. Н.* Специфика и виды информационно-рекламных источников в профориентационной работе вузов / М. Н. Кривцова. – Текст : непосредственный // Молодой ученый. – 2016. – № 8 (112). – С. 1274–1276. – URL: https://moluch.ru/archive/112/28578.

2. Определение понятия «образовательная реклама» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://trade.bobrodobro.ru/50817. – Дата доступа: 17.02.2020.

3. *Сагинова, О. В.* Маркетинг образовательных услуг / О. В. Сагинова // Маркетинг в России и за рубежом. – 2009. – № 1. – С. 3–8.

4. *Федорова, С. В.* Особенности рекламных коммуникаций в сфере образовательных услуг вузов / С. В. Федорова // Маркетинг в России и за рубежом. – 2009. – № 1. – С. 1–3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРАБЛЕМЫ ГРАМАДЗЯНСКА-ПАТРЫЯТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ У СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГРАМАДСТВЕ


***В. М. Белакурскі,***
*кандыдат філасофскіх навук,дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў;*

***Ж. Я. Белакурская,***
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*


Сёння ў нашай краіне працягваецца рэфармаванне ўсіх галін яе жыцця. Аналіз эканамічных, палітычных, сацыякультурных і іншых фактараў паказвае, што ў грамадскай свядомасці пакуль адсутнічае цэласнае ўяўленне аб грамадстве, якое мы імкнемся пабудаваць. Разам з тым ідэю дэмакратычнасці буду-

чага грамадства, яго адкрытасці, свабоды і адказнасці падзяляе пераважная большасць людзей.

Задача пабудовы дзяржавы з сацыяльнай накіраванасцю патрабуе распрацоўкі шляхоў, а таксама сродкаў фарміравання чалавека, здольнага жыць у новай грамадзянскай супольнасці. Дзяржава, як вядома, фарміруе падначаленых, а грамадзянская супольнасць выхоўвае асобу з неабходнымі грамадзянскімі якасцямі, выхоўвае грамадзян. У дадзеным працэсе даволі важная роля належыць ведам, таму час навучання маладога чалавека ў ВНУ аказвае вельмі моцны ўплыў не толькі на фарміраванне яго як будучага спецыяліста, але і асобы, грамадзяніна сваёй краіны. Сучасная студэнцкая моладзь адрозніваецца шэрагам уласцівых ёй асаблівасцей. Яна вызначаецца даволі высокай сацыяльнай мабільнасцю, крэатыўнасцю мыслення, выступае своеасаблівай крыніцай інавацый і ў той жа час з'яўляецца найбольш успрымальнай да іх. Аднак адсутнасць неабходнага жыццёвага вопыту бачыцца прычынай таго, што ў сучасным студэнцкім асяроддзі нярэдка даволі слаба выражана культура адказных грамадзянскіх паводзін. Значная частка маладых людзей мае нізкі ўзровень цікавасці да эканамічных і грамадска-палітычных праблем, неразборлівая пры выбары сродкаў дасягнення той ці іншай мэты, многім уласціва катэгарычнасць высноў і ацэнак, нават адмаўленне агульнапрынятых каштоўнасцей. Усё гэта надзвычай актуалізуе праблему грамадзянска-патрыятычнага выхавання моладзі.

Як грамадскае пачуццё патрыятызм уласцівы чалавецтву са старажытных часоў. У якасці выразнага сацыяльнага феномена патрыятызм заявіў аб сабе яшчэ ў класічную эпоху Старажытнай Грэцыі (V–IV ст. н. э.). Сінонімам гэтага паняцця выступала паняцце «арэтэ», якое можна перакласці як доблесць. У вучэнні Платона «арэтэ» ператвараецца ў імкненне да справядлівасці – найвышэйшай дабрачыннасці, якая аб'ядноўвае простых членаў поліса, а таксама заканадаўцаў, паколькі яна такім чынам надае дзяржаве не толькі даўгавечнасць, але і трываласць [2]. Арыстоцель, класіфікуючы дабрачыннасці, адзначаў, што найвышэйшым «арэтэ» ёсць дзейнасць, накіраваная на карысць грамадзян поліса [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У аўтараў Старажытнага Рыма патрыятызм набывае статус катэгорыі, якая вызначае сувязь чалавека і дзяржавы. У працы «Пра абавязкі» Цыцэрон падкрэсліваў: «… з усіх грамадскіх сувязей для кожнага з нас найбольш важнымі выступаюць нашы сувязі з дзяржавай. Дарагія нам нашы бацькі, дарагія нам нашы дзеці, сваякі, блізкія, сябры, але толькі адно грамадства ахоплівае ўсе прыхільнасці ўсіх людзей. Які чэсны чалавек будзе вагацца, каб пайсці дзеля яго на смерць, калі гэтым ён прынясе яму карысць?» [4, с. 78].

Цыцэрон адрозніваў паняцце радзімы па нараджэнні і радзімы па грамадзянстве, падкрэсліваючы, што аснову першай складае мясцовасць, а другой – права. Прыярытэт філосаф аддаваў апошняй, «дзякуючы якой «дзяржава» ахоплівае ўсю грамадзянскую абшчыну. За яе мы павінны быць гатовы страціць сваё жыццё, поўнасцю сябе ёй аддаць, укласці ў яе і ёй як бы прысвяціць усе свае годнасці» [4, с. 110].

Вытокі паняцця «грамадзянскасць» даследчыкі таксама знаходзяць у антычнай культуры. Поліснай дэмакратыі былі ўласцівы пэўныя ўяўленні аб грамадзянскасці, якая разглядалася ў якасці адной з найважнейшых дабрачыннасцей свабоднага жыхара поліса. Дзякуючы ёй свабоднага эліна адрознівалі ад варвара ці раба. Грамадзянскасць разумелася як удзел чалавека ў грамадскім, перш-наперш палітычным, жыцці свайго поліса, жаданне і ўменне жыць агульнымі для ўсіх жыхароў поліса справамі, несці асабістую адказнасць за рашэнне агульных праблем [1].

У савецкі час сістэма дзяржаўных каштоўнасцей фарміравалася на аснове адзінай марксісцка-ленінскай ідэалогіі, якая адмаўляла рэлігійную веру, прыватную ўласнасць, а таксама любыя праявы іншадумства. Паняцце грамадзянскасці было лімітавана ідэалогіяй і пераважна меркавалася як адказнасць кожнага савецкага чалавека перад дзяржавай, яго адданасць камуністычнай партыі і савецкай краіне, удзел у барацьбе па ўсталяванні камуністычных ідэалаў ва ўсім свеце. Савецкі патрыятызм вельмі цесна звязваўся з пралетарскім інтэрнацыяналізмам.

У першыя гады постсавецкага перыяду грамадзянскасць і патрыятызм як асноўныя катэгорыі «былой» дзяржаўнай ідэа-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

логіі падвяргаліся даволі жорсткай крытыцы з боку ліберальных апанентаў улады, якія нават сцвярджалі аб іх недарэчнасці ў жыцці сучаснай краіны, а таксама выхаванні маладога пакалення.

Сёння перад вышэйшай школай нарэшце паўстала задача цеснай узаемасувязі грамадзянскіх і патрыятычных каштоўнасцей у адукацыйна-выхаваўчым працэсе, паколькі яна павінна садзейнічаць фарміраванню не толькі кваліфікаванага, кампетэнтнага спецыяліста, але і сучаснага грамадзяніна-патрыёта [3]. Развіццё грамадзянскасці і патрыятызму студэнцкай моладзі ў дачыненні да сацыяльнага праекта сучаснай Беларусі і на далейшую гістарычную перспектыву – адзін з найважнейшых фактараў забеспячэння стабільнага развіцця і бяспекі нашай краіны. Ідзе актыўны працэс адраджэння беларускай патрыятычнай свядомасці. Патрыятызм запатрабаваны сучасным грамадствам як усведамленне і засваенне сацыякультурных, гістарычных, маральных каштоўнасцей народа, адданасці ім дзякуючы аднаўленню «повязі часоў». Значную ролю ў гэтым павінны адыгрываць дысцыпліны гуманітарнага профілю. Яны дазваляюць студэнту атрымаць сістэмныя веды аб чалавеку, грамадстве, яго гістарычным мінулым, культурных традыцыях, прыродзе, стаўленні чалавека да самога сябе, прыроды, універсуму. У выніку іх удумлівага засваення маладыя людзі будуць пастунова прыходзіць да асабістага пераканання ў тым, што феномен грамадзянскага соцыуму ўяўляе сабой вельмі складаную недзяржаўную самаарганізацыю грамадзян, аб’яднаных мэтай як задавальнення сваіх шматлікіх індывідуальных патрэб і інтарэсаў, так і рэалізацыі патэнцыяльных магчымасцей грамадства, накіраваных на карысць усіх і кожнага. Такая нефармальная арганізацыя соцыуму заўсёды сілкавалася энергіяй той своеасаблівай «крытычнай масы» адказных грамадзян, якія выразна бачылі свае правы і абавязкі і былі гатовы да адказных грамадзянскіх дзеянняў па самаарганізацыі і самакіраванні. У сваю чаргу патрыятызм усведамляецца як галоўная якасць грамадзяніна, аснова яго грамадзянскай пазіцыі. Асоба грамадзяніна як носьбіта патрыятычных каштоўнасцей вызначаецца сваёй падрыхтаванасцю да дзеянняў на карысць Айчыны. Яе своеасаблівым стрыжнем выступае патрыятычная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самасвядомасць, у якую інтэгравана сістэма ўяўленняў чалавека аб самім сабе як грамадзяніне-патрыёце, а таксама яго здольнасць да правільнай самаацэнкі сваёй грамадзянскай пазіцыі.

Гуманітарныя дысцыпліны, якія вывучаюцца студэнтамі ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі, з'яўляюцца асобай сферай развіцця патрыятычнай самасвядомасці. Вылучэнне ў іх змесце патрыятычных фактаў, ідэй, каштоўнасцей садзейнічае больш паспяховаму засваенню маладымі людзьмі структурных кампанентаў патрыятызму з улікам будучай прафесійнай дзейнасці.

У сённяшнім адукацыйна-выхаваўчым працэсе павінны знайсці сваё належнае месца дыялогавыя, гульневыя, праектныя, рэфлексіўныя і іншыя тэхналогіі, якія даволі эфектыўна садзейнічаюць забеспячэнню непарыўнага і паэтапнага развіцця кампанентаў грамадзянска-патрыятычнай самасвядомасці студэнтаў. Асобна адзначым, што змястоўнае напаўненне структурных кампанентаў патрыятычнай самасвядомасці маладога чалавека вылучае і адпаведныя крытэрыі ацэнкі яго інтэлектуальнага і духоўнага развіцця. Нагадаем найбольш важныя.

Так, кагнітыўны кампанент утрымлівае сістэму ўяўленняў студэнта аб сабе як грамадзяніне; дапамагае ўсвядоміць свае асабістыя якасці і магчымасці ў непарыўнай сувязі з інтарэсамі грамадства, дзяржавы, калектыву, накіроўвае на засваенне патрыятычных ідэалаў, сімвалаў і сэнсаў.

Эмацыянальна-каштоўнасны кампанент стварае сістэму ўстановак і адносін студэнта да самога сябе як сацыяльнага суб'екта, адказвае за ўсведамленне ім сваёй ідэнтычнасці з роднай культурай.

Дзейнасна-валявы кампанент кантралюе здольнасць маладога чалавека ставіць мэты ў сваёй патрыятычна арыентаванай дзейнасці, гатоўнасць да самастойнага свядомага выбару лініі паводзін, самарэгуляцыі і самакантролю патрыятычных паводзін, імкнення да самаўдасканалення.

Рэфлексіўна-ацэначны кампанент дазваляе студэнту арыентавацца ў сваім унутраным свеце, ацэньваць самога сябе як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадзяніна, больш выразна ўсведамляць свае моцныя і слабыя бакі.

Да асноўных прынцыпаў фарміравання і развіцця патрыятычнай самасвядамасці будучага спецыяліста трэба аднесці:

– варыятыўнасць суб’екта выхавання пры выбары і засваенні ім формаў і зместу сваёй дзейнасці ў па-за вучэбны час;

– актыўнасць і зацікаўленасць у сваім развіцці;

– гуманізм, які прадугледжвае стаўленне выхавальніка да суб’екта выхавання як самакаштоўнасці, свабоднай, творчай і адказнай асобы;

– талерантнае стаўленне да думак іншых людзей, павага да іншых культур, традыцый, ладу жыцця [2, с. 28–29].

У кантэксце адзначанага выхаваўча-адукацыйная прастора Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў бачыцца намі менавіта той унікальнай сістэмай шматбаковых і шматпланавых узаемадачыненняў суб’ектаў выхавання, дзе можа дастаткова эфектыўна і паспяхова вырашацца задача развіцця грамадзянска-патрыятычнай самасвядомасці студэнтаў. Пэўную дынаміку працэсу ўжо сёння надаюць творчыя намаганні прафесарска-выкладчыцкага складу па гарманізацыі інтэлектуальнай, эмацыянальна-пачуццёвай, мастацка-творчай, паводзінавай сфер кожнага студэнта.


1. *Аристотель.* Соч. : в 4 т. / Аристотель. – М. : Мысль, 1983. – Т. 4. – С. 375–644.

2. *Арламова, А. А.* Методологические ориентиры воспитания личности и гражданина России / А. А. Арламова // Педагогика. – 2010. – № 6. – С. 27–30.

3. Об основах государственной молодежной политики : Закон Респ. Беларусь от 7 дек. 2009 г. № 65 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2009. – № 300. – Рег. № 2/1617.

4. *Платон.* Соч. : в 4 т. / Платон. – М. : Мысль, 1994. – Т. 3. – С. 79–420.

5. *Цицерон.* О законах / пер. с лат. В. О. Горенштейн // Цицерон. Диалоги. О государстве. Об обязанностях. – М. : Наука, 1974. – С. 58–157.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ